УДК 94,438 (“1919–1928”)

***В.П. ГАРМАТНЫ***

# АГРАРНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМЕ ПОЛЬСКАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ПАРТЫІ НАРОДНА-НАЦЫЯНАЛЬНЫ САЮЗ (1919–1928 гг.)

*У артыкуле разглядаецца аграрнае пытанне ў праграме Народна-Нацыянальнага Саюза (ННС, Związek Ludowo-Narodowy, народныя дэмакраты, “эндэкі”, 1919–1928 гг.), адной з самых уплывовых палітычных сіл II Рэчы Паспалітай, якая выступала ў абарону інтарэсаў памешчыкаў і ў многім супрацьстаяла ажыццяўленню ў краіне аграрнай рэформы.*

## Уводзіны

На працягу ўсяго існавання II Рэчы Паспалітай (1919–1939 гг.) аграрнае пытанне заставалася невырашаным і надзвычай актуальным і злабадзённым. Абсалютную большасць тагачаснага насельніцтва краіны складала сялянства, якое востра пакутавала ад зямельнага голаду і ўскладала вялікія надзеі і спадзяванні на прадстаўнікоў кіруючай эліты [1, s. 95-97, 113]. У сувязі з гэтым існуючыя ў гэты час шматлікія палітычныя партыі і арганізацыі прапаноўвалі свае шляхі вырашэння аграрнай праблемы,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

імкнучыся схіліць сімпатыі сялянства на свой бок. Не стаў выключэннем і Народна-Нацыянальны Саюз, які быў на той час у міжваеннай Польшчы адною з самых уплывовых і аўтарытэтных палітычных арганізацый [2, s. 86, 98].

**Асноўная частка**

У лютым 1919 г. распачаў працу Заканадаўчы Сейм (Sejm Ustawodawczy), у хуткім часе ў яго шэрагах утварылася новая ўплывовая палітычная арганізацыя – Сеймавы Народна-Нацыянальны Саюз (ННС, Związek Sejmowy Ludowo-Narodowy) [3, s. 111]. 22 лютага 1919 г. сеймавы пасол (дэпутат) ННС Станіслаў Грабскі (Stanisław Grabski) у сваёй прамове выклаў свой погляд на вырашэнне аграрнай праблемы [4, s. 127], падкрэсліваючы неабходнасць стварэння дзяржаваю самых спрыяльных умоў для развіцця сельскай гаспадаркі краіны, у прыватнасці арганізацыю для сялян таннага крэдыта на меліярацыю надзела, выплату запазычанасцяў і куплю зямлі. Для надзялення малазямельных і беззямельных сялян зямлёю неабходна перадаць на іх карысць землі, якія засталіся без гаспадара, дзяржаўныя і касцёльныя маёнткі, а таксама землі, перададзеныя іх уласнікамі дабраахвотна на карысць ажыццяўлення аграрнай рэформы. Дзяржава павінна была кантраляваць зямельны гандаль і забяспечыць для сялян права першаснага набыцця [5, s. 70]. Грабскі падкрэсліваў неабходнасць пазбягання "дзікай парцэляцыі" (продажу сялянам часткі памешчыцкіх зямель), якая неапраўдана ўздыме кошт на зямлю і прынясе карысць толькі спекулянтам.

7 красавіка 1919 г. паслы эндэкаў унеслі ў Заканадаўчы Сейм праект ажыццяўлення аграрнай рэформы, згодна з якім у рукі сялянства павінен быў перайсці значны абшар зямлі: найперш за ўсё з дзяржаўных маёнткаў, уласнасці прадстаўнікоў былых пануючых дынастый і замежных грамадзян, набытай са спекуляцыйнымі мэтамі, а таксама землі, перададзеныя добраахвотна на карысць аграрнай рэформы. На дзяржаву ўскладаўся абавязак вызначэння коштаў, якія б задаволілі абодва бакі, а таксама кантроль над вядзеннем лясной гаспадаркі, рэгуляцыяй дарог і рэк.

Праграма аграрных пераўтварэнняў была комплексна распрацавана і прадугледжвала таксама ліквідацыю сервітутаў (права сумеснага карыстання зямельнай уласнасцю), ажыццяўленне камасацыі (хутарызацыі) і меліярацыі зямель, пашырэнне сельскагаспадарчай адукацыі, выдачу сялянам танных крэдытаў і г. д. Падкрэслівалася таксама неабходнасць ажыццяўлення ў краіне "аграрнай рэформы" (а не "рэформ"), якая павінна была ўпарадкаваць землекарыстанне на вёсцы і спрыяць павышэнню ўзроўню агульнай сельскагаспадарчай культуры [6, s. 340].

Першы Усепольскі з'езд ННС, у якім бралі ўдзел каля 3 000 дэлегатаў, прайшоў 11–12 мая 1919 г. [7, s. 17]. Вельмі хутка аказалася, што розніца ў поглядах на вырашэнне асноўных дзяржаўных праблем паміж галоўнымі складовымі часткамі новай арганізацыі занадата вялікая, таму з яе шэрагаў выйшлі некаторыя выбітныя палітыкі і іх прыхільнікі [8, s. 71]. Сацыяльную базу ННС складалі правыя сілы нацыянальнай накіраванасці, пры-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

намсі прадстаўнікі вышэйшых маёмасных класаў і грамадскіх груп: памешчыкі, капіталісты, банкіры, адвакаты і г. д., дзякуючы чаму партыя мела ў сваім распараджэнні значныя фінансавыя сродкі і выдавала шматлікія перыядычныя выданні [4, s. 127; 5, s. 61].

Галоўныя дыскусіі ў Сейме ішлі наконт вызначэння максімуму ўладання зямлёю. 10 ліпеня 1919 г. Заканадаўчы Сейм па прапанове ўрада Ігнацы Яна Падэрэўскага пасля працяглай гарачай дыскусіі прыняў “Прынцыпы зямельнай рэформы і аддзяржаўлення лясоў” (W przedmiocie zasad reform rolnej) – першы закон па аграрным пытанні ў II Рэчы Паспалітай [9, s. 261]. Закон прадугледжваў стварэнне хутароў і прырэзку зямлі карлікавым гаспадаркам з вызначаных памешчыцкіх маёнткаў, прычым агульная плошча надзела не павінна была перавышаць 25 маргоў (14 гектар, 1 морг – 0,56 га). Кошт зямлі не вызначаўся, аднак мясцовым уладам пры вызначэнні кошту зямлі прадпісвалася прымаць пад увагу не толькі яе “вытворчую вартасць”, але і вартасць пасеваў, меліярацыйныя работы і г. д. Уладальнікі самастойных гаспадарак пры магчымасці ўносілі плату наяўнымі, а малазямельныя сяляне маглі атрымаць ільготную дзяржаўную пазыку.

Закон ад 10 ліпеня 1919 г. хутчэй быў сеймаваю рэзалюцыяй і таму не атрымаў абавязковай сілы, але асноўныя яго палажэнні знайшлі працяг у наступных законах польскіх улад па аграрнаму пытанню [4, s. 135].

На II З’ездзе ННС 27 кастрычніка 1919 г. была прынята праграма партыі, якая прадугледжвала падтрымку нацыянальнай салідарнасці [3, s. 112-113], непарушнасць права прыватнай уласнасці, вырашальнае значэнне для польскага народа рымска-каталіцкай канфесіі, пошук саюзу з Францыяй у супрацьвагу Германіі, прыхільнасць рэспубліканскім і дэмакратычным выбарчым правам пры адначасовым вызначэнні абмежаванняў для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў (найперш за ўсё беларусаў і ўкраінцаў) [1, s. 125; 8, s. 71].

Праграма ННС патрабавала захавання польскага характару дзяржавы, каб найбольш важныя сферы грамадскага, эканамічнага і культурнага жыцця знаходзіліся ў польскіх руках. У справах эканамічных і грамадскіх праграма таксама мела нацыяналістычны характар, насіла патрабаванні пашырэння польскай уласнасці і падтрымання грамадскай раўнавагі, якая б запэўнівала народнае адзінства. ННС стаяў у абароне інтарэсаў прыватна-капіталістычнай гаспадаркі і выступаў супраць пашырэння дзяржаўнай эканамічнай ініцыятывы. Дзяржаве адводзілася роля грамадскага пасрэдніка, які б садзейнічаў наладжванню кантактаў паміж працоўнымі і наймальнікамі і такім чынам пазбяганню забастовак [3, s. 113].

ННС падтрымліваў пашырэнне і эканамічнае ўзмацненне польскага сярэдняга класа, у тым ліку на вёсцы. Па аграрнаму пытанню народныя дэмакраты падтрымлівалі ажыццяўленне дабраахвотнай парцэляцыі, ставілі галоўнаю мэтаю “захаванне асновы прыватнай уласнасці і эканамічнай свабоды” і дабіваліся “паляпшэння структуры землеўладання шляхам пазбаўлення празмерных супрацьлегласцяў і стварэння шматлікіх замож-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ных гаспадарак, якія, валодаючы дастатковымі ўмовамі для эканамічнай самастойнасці і тэхнічнага развіцця, з'яўляюцца найлепшаю падставаю сацыяльнай раўнавагі" [10, s. 27]. Дзеля дасягнення азначанай мэты неабходна была рэалізацыя наступнай комплекснай праграмы: 1) кантроль дзяржавы над абаротам зямлі і права першаснага выкупа маёнткаў, вызначаных на продаж; 2) правядзенне дзяржаўнай парцэляцыі і каланізацыі разам з выдачаю сялянам танных крэдытаў на куплю зямлі; 3) продаж зямлі малазямельным і беззямельным сялянам, найперш за ўсё з маёнткаў членаў былых пануючых дынастый, а таксама набытых са спекуляцыйнымі мэтамі, дрэнна гаспадараванымі і г. д. [11, s. 67-68].

Стварэнне шматлікіх эканамічна самастойных рынкаваарыентаваных сялянскіх хутарскіх гаспадарак з'яўлялася мэтаю аграрнай палітыкі ННС, які выступаў катэгарычна супраць вызначэння норм, абмяжоўваючых памер землеўласніцкай гаспадаркі і рэгулявання дзяржаваю коштаў на зямлю. У праграме ННС патрабавалася, каб аграрная рэформа "аблягчала стварэнне буйных сялянскіх гаспадарак, а не тармазіла б іх развіццё забаронаю пакупкі зямлі больш вызначанай нормы" [5, s. 87].

ННС прызнаваў за дзяржаваю права на прымусовы выкуп зямлі ў такіх буйных гаспадарках, дзе якасць апрацоўкі глебы не адпавядала тагачаснаму ўзроўню вядзення сельскай гаспадаркі. Такім шляхам нацыянал-дэмакраты меркавалі ўпарадкаваць фінансы буйных польскіх землеўласнікаў, прымушаючы дзяржаву выкупаць у іх лішкі зямлі. Праграма ННС патрабавала, каб аграрная рэформа ахапіла ў першую чаргу дзяржаўныя землі і зусім не чапала "сярэдніх маёнткаў, асновы сельскагаспадарчага развіцця будучых гаспадарак" [12, с. 103].

У цэлым праграма партыі была кампрамісам паміж памешчыкамі і багатымі сялянамі. Першыя атрымоўвалі магчымасць адбудаваць зруйнаваныя пад час вайны маёнткі і захаваць зямлю ў сваіх руках, а таксама гарантыю далейшай падтрымкі. Неабходна таксама падкрэсліць, што ў праграме было няясна абумоўлена, якія маёнткі можна лічыць дрэнна загаспадараванымі і павіннымі быць перададзенымі на ажыццяўленне парцэляцыі. Што датычыць вярхушкі сялянства, то яна атрымала перспектыву набыцця зямлі і атрымання таннага крэдыта на камасацыю і меліярацыю.

15 ліпеня 1920 г., пад час найбольшай небяспекі для існавання Польскай дзяржавы, Сейм у хуткім парадку, нават без абмеркавання, аднагалосна прыняў новы, больш радыкальны, закон аб зямельнай рэформе: "Выканаўчыя правілы да закону аб зямельнай рэформы ад 10 ліпеня 1919 г." (Ustawa z dnia 15 lipca 1920 r. o wykonaniu reformy rolnej) [13, s. 153], якія прадугледжвалі надзяленне сялян зямлёю праз выкуп яе за палову рынкавага кошту (80% утвараемага зямельнага фонду вызначалася менавіта для гэтых сялян). Першынства ў набыцці зямлі адводзілася інвалідам вайны, сельскагаспадарчым рабочым і малазямельным сялянам, меркавалася аказанне ім вялікай дапамогі ў форме ільготных крэдытаў на набыццё зямлі. Неабходна адзначыць, што прадстаўнікі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ННС па розных прычынах рэзка крытыкавалі змест і рэалізацыю на практыцы прынятых Сеймам аграрных законаў 1919 і 1920 гг. [14, s. 126].

Паводле рэляцыі (справаздачы) паслоў ННС, складзенай у лістападзе 1920 г., насельніцтва Заходняй Беларусі знаходзілася ў вельмі складаным матэрыяльным становішчы і апынулася на мяжы выжывання: “Становішча гэтых трохі больш дваццаці ўсходніх паветаў, на якіх толькі што скончыліся баявыя дзеянні, ёсць проста жахлівае. Тут мелюць чабор, траву гатуюць без солі, хлеб з батвы бураковай (так у дакуменце) і нават без дамешку мукі... становіцца ў наваколлі адзінаю крыніцаю харчавання (гэтых) людзей, якія паміраюць тысячамі” [9, s. 26-27].

У шэрагах ННС не было адзінства ў поглядах на ажыццяўленне ў краіне аграрных пераўтварэнняў [4, s. 129]. 17 мая 1923 г. на сустрэчы кіруючых колаў Польскай Народнай Партыі-“Пяст” (Polskie Stronnictwo Ludowe-“Piast”), ННС і польскіх хрысціянскіх дэмакратаў у Варшаве ўдалося пераадолець некаторыя супярэчнасці і падпісаць дамову аб сумесных намаганнях (“Ланцкаронскі пакт”, па маёнтку Ланцкарон, які належаў сенатару Людвіку Гамерлінгу) [3, s. 118], у якой адзначалася, што “ў сферы сельскай гаспадаркі неабходна як мага хутчэйшае правядзенне аграрнай рэформы, ажыццяўленне меліярацыі і камасацыі зямель і прызнанне сельскай гаспадаркі як асновы нацыянальнага эканамічнага развіцця, неабходна апека праз выдачу крэдытаў для сялян..., паляпшэнне дарожнай сеткі, рэгуляцыя рэк, засаджванне лесам пясчаных берагоў” і г. д. (IX глава “Гаспадарчая палітыка”). Акрамя таго, у пакце асабліва падкрэслівалася неабходнасць асушэння і гаспадарчага выкарыстання вялікіх зямельных абшараў на Палессі [15, с. 46].

Адным з галоўных лідараў ННС быў Уладзіслаў Грабскі (Władysław Grabski), брат Станіслава, які ў снежні 1923 – лістападзе 1925 гг. займаў пасаду прэм’ер-міністра [7, s. 29], што дало ННС выдатную магчымасць рэалізоўваць сваю праграму на практыцы. У снежні 1924 г. урад Грабскага выступіў у Сейме з новым аграрным законапраектам, паводле якога прадугледжвалася адчужэнне без выкупу памешчыцкіх зямель Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны на карысць вайсковых і грамадзянскіх асаднікаў (перасяленцаў-каланістаў з карэннай Польшчы, якім на ільготных умовах перадаваліся свабодныя зямельныя надзелы). За тры сеймавыя чытанні ў тэкст законапраекта ўнесена аж 903 (па іншых звестках 603) папраўкі і 20 ліпеня 1925 г. Сейм II Рэчы Паспалітай ухваліў разглядаемы законапраект, затым праект аграрнай рэформы быў перададзены ў Сенат, які падрыхтаваў свае заўвагі [9, s. 262].

26 ліпеня 1925 г. Сейм II Рэчы Паспалітай адхіліў сумесны аграрны законапраект левых, які прадугледжваў бясплатнае надзяленне сялян зямлёю. Пры абмеркаванні законапраекта вялася гарачая дыскусія і справа ледзьве не дайшла да бойкі паміж прадстаўнікамі розных палітычных

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

накірункаў, але ў рэшце рэшт паслам удалося прыняць "Закон аб правядзенні зямельнай рэформы" (Ustawa o wykonaniu reformy rolnej) [13, s. 205], які больш вядомы ў гістарыяграфіі як "Закон аб парцэляцыі і асадніцтве". За аграрны законапраект прагаласавалі 200 сеймавых паслоў (пераважна правыя), супраць – 89 (прадстаўнікі левых арганізацый і нацыянальнальных меншасцяў). Прадстаўнікі рэвалюцыйнага крыла Сейма не прынялі ўдзел у галасаванні, чым выказалі недавер урадаваму аграрнаму законапраекту.

28 снежня 1925 г. Сенат зацвердзіў канчатковы варыянт аграрнай рэформы, распрацаванай на базе "Ланцкаронскага пакту". Новы закон насіў характар кампрамісу праектаў розных палітычных партый і арганізацый і стаў асноваю далейшай урадавай аграрнай палітыкі [14, s. 126-127]. Аграрная рэформа 1925 г. складалася з насаджэння вайсковых і цывільных асаднікаў, ажыццяўлення парцэляцыі, правядзення камасацыі і ліквідацыі сервітутаў. Паводле закону "зямельнае ўпарадкаванне Рэчы Паспалітай Польскай будзе абапірацца на моцныя, здаровыя, здольныя да інтэнсіўнай вытворчасці гаспадаркі рознага тыпу і памераў, уяўляючыя прыватную ўласнасць іх уладальнікаў", што азначала далейшую перабудову сельскай гаспадаркі краіны на капіталістычнай аснове з арыентацыяй на рынак [15, с. 45].

Пасля майскага пераварота 1926 г. ННС перайшло ў апазіцыю да рэжыма Юзэфа Пілсудскага, што прывяло да рэпрэсій у адносінах да арганізацыі і памяншэнне яе ўплыву. У сакавіку 1928 г. у выніку выбараў у Сейм II Рэчы Паспалітай ННС выступіў у блоку з іншымі польскімі нацыяналістычнымі правымі сіламі, што ў выніку прынесла каля 9% галасоў выбаршчыкаў і 37 пасольскіх мандатаў. У чэрвені таго ж года па ініцыятыве парламенцкага клуба ННС адбылася сустрэча прадстаўнікоў розных эндэцкіх арганізацый, на якой было прынята рашэнне на базе ННС стварыць з удзелам іншых правых сіл новую палітычную арганізацыю – Нацыянальную Партыю (Stronnictwo Narodowe), якая канчаткова была афармлена восенню 1928 г. [7, s. 31-32].

### Заключэнне

У 1919–1928 г. ННС знаходзіўся на правым флангу палітычных сіл II Рэчы Паспалітай, а па аграрнаму пытанню выступаў супраць падзелу паміж сялянамі значнай колькасці памешчыцкіх зямель, пры адначасовай падтрымцы і развіцці сялянскіх гаспадарак, найперш за ўсё павышэнню ўзроўню культуры апрацоўкі зямлі. Праграма ННС была з эканамічнага пункту гледжання рацыянальнаю спробаю перабудовы аграрных адносін, якая не абмяжоўвалася парцэляцыяй, але прадугледжвала імкненне да развіцця сельскай гаспадаркі інтэнсіўным шляхам. Аграрная праграма ННС цалкам не была рэалізавана, але аказала значны ўплыў на распрацоўку ўрадам праграмы аграрных пераўтварэнняў. Па ініцыятыве і пры актыўнай падтрымцы ННС Сей-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мам II Рэчы Паспалітай 28 снежня 1925 г. прыняты закон аб ажыццяўленні ў краіне аграрнай рэформы, які з'яўляўся кампрамісным варыянтам і прадугледжваў надзяленне сялян зямлёю праз выкуп, правядзенне камасацыі і ліквідацыі сервітутаў, што ў цэлым павінна было садзейнічаць развіццю сельскай гаспадаркі і станаўленню ў аграрнай сферы рынкавых адносін.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. ***Leczyk, M.*** Oblicze spoleczno-polityczne Drugiej Rzeczypospolitej / M. Leczyk. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1988. – 506 s.
2. Dziedzictwo: ziemianie polscy i udział ich w życiu narodu / pod red. Tadeusza Chrzanowskiego. – Kraków : Wydawnictwo Znak, 1996. – 301 s.
3. ***Holzer, J.*** Mozaika polityczna Drugiej Rzeczypospolitej / J. Holzer. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1974. – 670 s.
4. ***Wątor, A.*** Działalnosc Związku Ludowo-Narodowego w latach 1919–1922 / A. Wątor. – Szczecin : Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Szczecińskiego, 1992. – 163 s.
5. ***Bełcikowska, A.*** Stronnictwa i związki polityczne w Polsce / A. Bełcikowska. – Warszawa : Dom Książki Polskiej, 1925. – 1086 s.
6. ***Maj, E.*** Związek Ludowo-Narodowy, 1919–1928. Studium z dzejów myśli politycznej / E. Maj. – Lublin : Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2000. – 503 s.
7. ***Faliński, St.*** Poglądy społeczno-ekonomiczne Związku Ludowo-Narodowego / St. Falinski. – Warszawa : Wyższa Szkola Informatyki, Zarządzania i Administracji, 2007. – 155 s.
8. ***Brzoza, Cz.*** Polska w czasach niepodległości i II Wojny Światowej (1918–1945) / Cz. Brzoza. – Kraków : Fogra, 2001. – 424 s.
9. Historia chłopów polskich. W 3 tomach. T. 3. Okres II Rzeczypospolitej i okupacji hitlerowskiej / pod red. St. Inglota. – Warszawa : Ludówa Spółdzielna Wydawnicza, 1980. – 715 s.
10. Programy partii i stronnictw politycznych w Polsce w latach 1918–1939. – Rzeszów : Wyższa Szkoła Pedagogiczna w Rzeszowie, 1993. – 456 s.
11. ***Wojtas, A.*** Problematyka agrarna w polskiej myśli politycznej 1918–1948 / A. Wojtas. – Warszawa : Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1983. – 484 s.
12. Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине / под ред. С. Скульского. – Минск : Издательство Белорусской Академии Наук, 1935. – 336 с.
13. ***Madajczyk, C.*** Burżuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce: (1918–1939) / C. Madajczyk. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1956. – 465 s.
14. ***Kornaś, J.*** Narod i panstwo w mysli politycznej Związku Ludowo-Narodowego / J. Kornaś. – Kraków : Akademia Ekonomiczna w Krakowie, 1995. – 172 s.
15. ***Гарматны, В.П.*** Уладзіслаў Грабскі і закон аб аграрнай рэформе ад 28 снежня 1925 г. / В.П. Гарматны // Личность в истории: героическое и трагическое: материалы Четвертой Междунар. науч.-практ. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, Брест, БрГУ имени А.С. Пушкина, 26–27 ноября 2010 г. – Брест : БрГУ, 2011. – 178 с. – С. 44–50.


Паступіў у рэдакцыю 22.10.2012 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова